ния действительности региональные СМИ испытывают в отношениях с местными властями, которые являются их учредителями.

Таким образом, белорусские СМИ имеют огромный потенциал в эффективном информационном обеспечении политики регионального развития Республики Беларусь. Конструктивному решению поставленных задач будет способствовать поддержка основных ее ориентиров тематикой, налаживание эффективной коммуникации между СМИ и властями, беспристрастность в подаче информации, воспитание активной, деятельной аудитории, что особенно актуально в переходный период, когда меняется парадигма этой политики.

*Литература*


1. Богданович, А. В. Региональная политика Республики Беларусь на современном этапе / А. В. Богданович // Белорусский экономический журнал. – 2016. – № 4.– С. 63–74.
2. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь до 2030 г. // Экономический бюллетень НИЭИ Министерства экономики Республики Беларусь. – 2015. – № 4. – 100 с.
3. Программа деятельности Правительства Республики Беларусь на 2016–2020 годы // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C21600274. – Дата доступа : 10.09.2017.
4. Слука, О. Г. Противоречия в национальной коммуникации / О. Г. Слука [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://elib.bsu.by/handle/123456789/18214. – Дата доступа : 29.08.2017.



**Марына Прахарэня**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*


## НАПРАМКІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВЫ Ў ПРАКТЫЦЫ АБЛАСНЫХ ВЫДАННЯЎ (на прыкладзе газеты «Мінская праўда»)

У канцы 1930-х гг. у савецкай краіне сталі звяртацца да пытання аб арганізацыі абласцей – прамежкавага звяна паміж цэнтрам і раёнамі. Так, ужо ў студзені 1938 г. у БССР былі ўтвораны Віцебская, Гомельская, Магілёўская, Мінская і Палеская вобласці. Пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы была арганізавана дзейнасць новага тыпу рэгіянальнай перыёдыкі – абласных газет, мэтай якіх стала інфармаванне насельніцтва і асвятленне мясцовых падзей. Як правіла, гэтыя выданні ствараліся на базе ўжо існуючых раённых. Так, у 1938 г. першыя аблас-

ныя газеты з’явіліся ў Гомельскай вобласці («Гомельская праўда»), Магілёўскай («Магілёўская праўда»), Віцебскай («Віцебскі рабочы»).

1 лістапада 1950 г. была заснавана абласная газета «Мінская праўда» (МП). Да гэтага часу Міншчына не мела свайго выдання, яго функцыі выконвала «Звязда». У хуткім часе газета цэнтральнай вобласці, якая шмат у чым вызначала вектар развіцця ўсёй краіны, стала своеасаблівым метадычным цэнтрам для журналістаў гарадскіх і раённых выданняў. Менавіта на старонках «Мінскай праўды» на розных гістарычных этапах выпрацоўваліся механізмы арганізацыі эфектыўнага дыялогу паміж мясцовымі ўладамі і грамадствам, што садзейнічала развіццю партнёрскага ўзаемадзеяння, умацаванню стабільнасці ў рэгіёне, матывацыі і мабілізацыі яго жыхароў да эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай актыўнасці, фарміраванню грамадзянскай культуры. У мэтах даследавання асаблівасцей зместу, прыярытэтных тэматычных накірункаў газеты «Мінская праўда» быў праведзены кантэнт-аналіз кожнага дзясятага нумара абласнога выдання за перыяд 1950–2016 гг. Дадзенае даследаванне дало магчымасць выявіць асноўныя тэндэнцыі ўзаемадзеяння органаў улады і насельніцтва, прасачыць накірункі арганізацыі камунікацыі паміж грамадскасцю і дзяржавай у розныя перыяды гісторыі нашай краіны.

Так, значная колькасць публікацый рэгіянальнага выдання прысвечана выбарам – галоўнаму палітычнаму інстытуту. Нягледзячы на супярэчлівыя і неадназначныя ацэнкі, сістэма кіравання ў БССР, прадстаўленая выбарнымі сельскімі і пасялковымі саветамі, раённымі, гарадскімі і абласнымі Саветамі дэпутатаў, Вярхоўным Саветам БССР і СССР, забяспечвала шырокі ўдзел насельніцтва ў палітычным жыцці краіны. Дэпутаты як прадстаўнікі ўсіх колаў грамадства на аснове калегіяльнасці дэманстравалі імкненне справядліва і кваліфікавана вырашаць пытанні.

У адпаведныя перыяды абласная газета расказвала аб ходзе выбарчай кампаніі, знаёміла чытачоў з кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых і вышэйшых прадстаўнічых органаў улады. Рэгулярна публікаваліся матэрыялы аб сутнасці прававой сістэмы выбараў, іх працэдуры, асаблівасцях і г. д. «Выбары ў мясцовыя Советы і задачы абласной партарганізацыі» (МП, 01.11.1950), «Сустрэча з кандыдатам» (МП, 05.12.1951), «Агітпункт – цэнтр работы з выбаршчыкамі» (МП, 30.01.1954) і інш. На працягу 1950-х – пачатку 1990-х гг. гэта тэматыка заставалася даволі актуальнай.

Рэгіянальны друк у новых умовах развіцця суверэннай і дэмакратычнай Рэспублікі Беларусь прадаўжае традыцыю сістэмнага асвятлен-

ня выбарчых працэсаў. У першай палове 1990-х гг. кантэнт «Мінскай праўды» папоўніўся аналітычна-дыскусійнымі матэрыяламі пра выбарчыя кампаніі, якія суправаджаліся фракцыйнай барацьбой у парламенце, рэфармаваннем сістэмы выканаўчай улады, вызначэннем палітычнага статусу нашай дзяржавы, станаўленнем шматпартыйнасці: «Партый як грыбоў. А карысці…» (МП, 03.04.1992), «Подпісы сабраны, працягваецца іх аўтэнтычнасць» (МП, 29.01.1994), «Ніхто не набраў галасоў» (МП, 16.05.1995) і г. д. У 1995–1996 гг. рэдакцыйны калектыў абласной газеты разгарнуў шырокую інфармацыйную дзейнасць па тлумачэнні сутнасці значнага інстытута грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы – рэферэндуму. У спецыяльных рубрыках «Рэферэндум: “за” і “супраць”», «З нагоды рэферэндума», «Рэферэндум: адкрытая размова» друкаваліся матэрыялы, прысвечаныя падрыхтоўцы да ўсенароднага галасавання, разглядаліся пытанні, вынесеныя для абмеркавання: наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай, эканамічная інтэграцыя з Расійскай Федэрацыяй, спыненне паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета, змена дзяржаўнай сімволікі, прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інш.

У наш час тэма выбараў па-ранейшаму рэгулярна асвятляецца «Мінскай праўдай». Сёння тут друкуюцца не толькі рэпартажы з месцаў, інфармацыя аб зборы подпісаў, але і апытанні выбаршчыкаў, інтэрв’ю з лідарамі грамадскіх аб’яднанняў, кіраўнікамі тэрытарыяльных камісій, наглядальнікамі, вядзецца тлумачэнне норм Выбарчага кодэкса. Газета з’яўляецца эфектыўнай пляцоўкай для камунікацыі. Тут выбаршчыкі могуць абменьвацца меркаваннямі, прачытаць каментарый спецыяліста, задаць пытанне кандыдату ў дэпутаты і атрымаць аператыўны адказ на сайце выдання. Напярэдадні найважнейшай грамадска-палітычнай падзеі традыцыйнымі становяцца рубрыкі «Насустрач выбарам», «Хроніка перадвыбарнай кампаніі», «Рыхтуемся да выбараў», «Афіцыйна». Падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2015 г. у газеце друкаваўся каляндар-застаўка «11 кастрычніка – выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», а таксама вёўся падлік «Да выбараў засталося … дзён».

11 верасня 2016 г. у Рэспубліцы Беларусь у шосты раз адбыліся выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. «Мінская праўда» выступала актыўным удзельнікам гэтага працэсу. Матэрыялы спецыяльнай рубрыкі «Выбары-2016» усебакова знаёмілі чытачоў з ходам перадвыбарнай кампаніі, праграмамі кандыдатаў у дэпутаты, справаздачамі наглядальнікаў, анансавалі сустрэчы з электаратам, выступленні на радыё і тэлебачанні.

Такім чынам, абласная газета не толькі выступае сродкам інфармавання электарату, але і дапамагае мясцоваму насельніцтву інтэгравацца ў працэс фарміравання органаў улады. З'яўляючыся інструментам грамадзянскага кантролю, выданне ўключаецца ў будаўніцтва ўстойлівага грамадства, дзе кожны чалавек свядома і кампетэнтна можа прымаць ўдзел у вырашэнні актуальных пытанняў дзяржаўнага жыцця. Фарміруючы грамадскую думку аб значнасці гэтай найважнейшай грамадска-палітычнай падзеі, рэгіянальная перыёдыка выхоўвае палітычна адукаванага і правасвядомага грамадзяніна, садзейнічае фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў насельніцтва.

Не менш важным накірункам дзейнасці «Мінскай праўды» з'яўляецца забеспячэнне адкрытасці структур улады і асвятленне дзейнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якую ажыццяўляюць абласныя, раённыя і сельскія выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады. У шматлікіх матэрыялах савецкага перыяду, якія размяшчаліся ў рубрыках «Саветы і вопыт», «Савецкае будаўніцтва», «Саветы і жыццё», «У імя чалавека, на карысць чалавека», «У мясцовых камітэтах», «Саветы: дзень за днём» і інш., рэдакцыя давала чытачам інфармацыю аб пасяджэннях, сесіях, мерапрыемствах, рашэннях выканкамаў, расказвала аб канкрэтнай практыцы іх работы ў вырашэнні пытанняў паводле пісьмовых і вусных зваротаў грамадзян. У паведамленнях аб надыходзячай сесіі, справаздачах падкрэслівалася, што «Мясцовы Савет – гэта вышэйшы дзяржаўны орган на тэрыторыі вобласці, раёна, горада, вёскі, пасёлка. У цэнтры ўвагі Савета і яго выканкома заўсёды павінен стаяць чалавек, яго бытавыя і духоўныя патрэбнасці» [1]. Рэдакцыя прапаноўвала чытачам выказваць свае меркаванні па ўносімых на разгляд сесій пытаннях, забяспечваючы публічнасць работы мясцовых органаў улады, павялічваючы інфармаванасць грамадства.

Сёння «Мінская праўда» працягвае пісаць аб рабоце органаў мясцовага самакіравання – абласнога, раённых і гарадскіх, сельскіх выканаўчых камітэтаў. Як правіла, інфармацыя аб іх дзейнасці прадстаўлена ў рубрыках «У аблвыканкаме», «Вакол улады», «Вертикаль: власть и ответственность», «Власть: пути реализации», «Савет: радыус дзеяння», «Улада мясцовая», «Людзі ўлады», «Прамая лінія», «За зваротам – чалавек», «Улада: спектр праблем».

Асаблівая ўвага надаецца дзейнасці выбраннікаў народа – дэпутатаў, неаднаразова падкрэсліваецца, што іх галоўны абавязак – клопат аб дабрабыце сваіх выбаршчыкаў, адказнасць: «Дэпутат павінен быць для выбаршчыкаў блізкім чалавекам. Трэба, каб яго ўсюды чакалі, дзяліліся

з ім запаветнымі думкамі. Вельмі важна, каб, прыходзячы да людзей, дэпутат не адчуваў сябе «афіцыяльнай асобай», а мог проста, як кажуць, на роўных, разам абмеркаваць справы выбаршчыкаў» [2]. Аб дзейнасці дэпутатаў расказаецца ў такіх рубрыках, як «Дэпутат і жыццё», «Кандыдаты народа», «Дэпутаты за работай», «Дэпутату даручылі», «Дэпутат у акрузе», «Сходы дэпутатаў», «Улада і асоба», «Вакол улады», «Людзі ўлады», «Улада мясцовая».

Пасля распаду СССР практыка работы прадстаўнічых дзяржаўных органаў – мясцовых Саветаў дэпутатаў – была прадоўжана. Пашырыліся іх паўнамоцтвы. Нарматыўна-прававая база нашай краіны забяспечвае аўтаномію мясцовых інтарэсаў, юрыдычную гарантыю функцыянавання мясцовых саветаў, падкрэслівае іх вызначальную ролю ў кіраванні камунальнай уласнасцю і права на самастойнае размеркаванне мясцовага бюджэту.

«Мінская праўда», з'яўляючыся друкаваным органам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, рэгулярна асвятляе яго дзейнасць. Рэдакцыя анансуе сесіі, пасяджэнні, расказвае аб прынятых рашэннях, рабоце са зваротамі, заявамі, прапановамі грамадзян («Сесія абласнога Савета народных дэпутатаў» (МП, 24.01.1992), «Ці чуецца голас улады?» (МП, 18.03.1997), «Ответственность – персональная» (МП, 27.08.1998), «Дэпутацкі тандэм людзям на карысць» (МП, 22.10.2002), «Не оставаться просто наблюдателем» (МП, 04.01.2005), «Пытанні асабістыя – справы агульныя» (МП, 05.04.2008), «Ахова здароўя – клопат дэпутатаў» (МП, 19.03.2009), «На прыёме ў дэпутата» (МП, 25.10.2014) і інш.). У 2014 г. з'явіўся сумесны праект «Мінскай праўды» і Мінскага абласнога Савета дэпутаў «Дэпутат». Яго мэта – пастаяннае інфармаванне грамадзян аб прымаемых рашэннях, разгляд пытанняў аб уладкаванні жыллёва-бытавых праблем насельніцтва, добраўпарадкаванні тэрыторый і пад. Гэта праца дапамагае насельніцтву рэгіёна быць у курсе важных пытанняў мясцовага значэння, пільна сачыць за функцыянаваннем выбранай сістэмы кіравання, рэагаваць на яе хібы. У сваю чаргу, інстытут дэпутацтва, забяспечваючы рэальны ўдзел грамадзян у кіраўніцтве краінай, садзейнічае арганічнаму спалучэнню правоў і свабод грамадзяніна з яго абавязкамі і адказнасцю, з'яўляецца крытэрыем дэмакратычнасці і немалаважным кампанентам для функцыянавання грамадзянскай супольнасці.

У апошні час даволі папулярнай на старонках газеты стала тэма грамадскага самакіравання, у прыватнасці – дзейнасць упаўнаважаных

сельскіх населеных пунктаў – стараст, якія, праяўляючы ініцыятыўнасць, сацыяльную адказнасць, актыўнасць, выступаюць дадатковым злучальным звяном паміж мясцовай уладай і насельніцтвам («Староста ў вёсцы. Пагодзімся?» (МП, 12.04.1997), «Воложинские “старосты”» (МП, 06.11.1998), «Грамадствам запатрабаваныя» (МП, 15.05.2003), «Ідуць да старасты вяскоўцы» (МП, 10.02.2004), «Старэйшына» (МП, 28.02.2004), «І стараста, і дэпутат» (МП, 28.02.2009) і інш.).

На працягу сваёй дзейнасці рэдакцыя газеты «Мінская праўда» ў поўнай ступені развівае партнёрскае ўзаемадзеянне ўлады і соцыуму – немалаважны кампанент для функцыянавання грамадзянскай супольнасці. Рэгіянальнае выданне, забяспечваючы гарантыі публічнасці, садзейнічае павышэнню адказнасці органаў улады за вырашэнне надзённых пытанняў мясцовага жыцця, дазваляе своечасова прымаць рашэнні. Ажыццяўляючы дзейнасць па забеспячэнні інфармацыйнай адкрытасці і празрыстасці ўлады, «Мінская праўда» ўмацоўвае давер грамадзян, дапамагае прымаць рэальны ўдзел у кіраванні краінай, тым самым захоўваючы прынцыпы народаўладдзя і выступаючы эфектыўным інструментам фарміравання грамадзянскай супольнасці.

*Літаратура*

1. Выканком Савета // Мінская праўда. – 1964. – 22 снеж. – С. 1.
2. Мерка дэпутацкай актыўнасці // Мінская праўда. – 1965. – 24 ліст. – С. 2.

**Алег Слука**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ФІЛОСАФ ПАЎНОЧНАЙ ВЕНЕЦЫІ

Паўтысячагоддзя таму назад *Францыск Скарына* вылецеў з *Полацкай зямлі* на хвалі прадчування цывілізаванай змены эпохі. Такі прывід выдаткоўваецца Усявышнім тварцом толькі абраным сваім слугам на нашай зямлі. У юнака зарадзілася ўпэўненае бачанне касмічных пераўтварэнняў у жыцці, ён адчуў у сабе сілу быць сейбітам на асветным і навуковым полі і птушкай жадання ляцеў адразу ў Кракаў, а затым у старажытны ўніверсітэт у італьянскім горадзе Падуя, каб абвастрыць і выпрабаваць свой талент у сістэме спасціжэння «свабодных мастацтваў». Нібыта напрарочылі заморскія купцы італьянскі шлях «шукальніка асветы», параўноўваючы яго родны Полацк з воднай жамчужынай Італіі – Венецыяй. Аказалася, што гэта добры знак для маладога чалавека і каштоўнае супадзенне абставін для многіх пакаленняў беларусаў.